# Кіраўнікі матфака даюць адказ

30 чэрвеня ў «Беларускім універсітэце» апублікаваны артыкулы «Падрыхтоўка кадраў па завочнай сістэме — важная дзяржаўная справа» і «Арыфметыка страт», дзе, у прыватнасці, крытыкаваўся матэматычны факультэт за слабую работу на завочным аддзяленні. Артыкулы абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедраў у пачатку навучальнага года і на адкрытым партсходзе факультэта 24 лістапада.

На пасяджэннях кафедраў прыняты рашэнні аб своечасовым прадстаўленні тэматыкі курсавых і кантрольных работ і якасным рэцэнзаванні работ. Кафедры і дэканат прымаюць меры да ліквідацыі цякучасці кадраў, што працуюць на завочным аддзяленні.

У пастанове, прынятай партсходам, гаворыцца аб неабходнасці наведання лекцый і практычных заняткаў, якія праводзяцца на завочным аддзяленні, аб своечасовым зацвярджэнні працоўных планаў на перыяд зімовай сесіі, аб абмеркаванні на кафедрах пытання аб падрыхтоўцы да сесіі, аб неабходнасці напісання падручнікаў і дапаможнікаў для студэнтаў-завочнікаў.

Дэканат і партыйная арганізацыя матфака лічуць неабходным адзначыць, што цякучасць кадраў на завочным факультэце была выклікана тым, што кантынгент студэнтаў у апошнія гады значна вырас, а штат выкладчыкаў засгаецца ранейшым. У сувязі з гэтым у пачатку навучальнага года выкладчыкам, што вядуць работу на завочным аддзяленні, даручалася работа на дзённым аддзяленні (каб не зрываўся вучэбны працэс), а ў снежні да работы з завочнікамі прыцягваліся выпускнікі факультэта, якія завяршаюць навучанне да канца каляндарнага года.

З мэтаю змяншэння адсеву студэнтаў мэтазгодна было б дазволіць кіраўнікам вышэйшых навучальных устаноў прымаць на першыя курсы некаторую колькасць студэнтаў звыш плана, без выдзялення ўстанове дадатковых штатаў і асігнаванняў. Гэтае пытанне неабходна было б пастаўіць перад вышэй стаячымі органамі.

**Дэкан матэматычнага факультэта А. ГУСАК**

**Сакратар партбюро факультэта А. САМСОНАЎ**



*Для гераічнага вострава Свабоды святкаванне Новага года супадае са святкаваннем гадавіны рэвалюцыі. Кубінскія студэнты, што навучаюцца ў беларускіх вышэйшых навучальных установах, таксама рыхтуюцца дастойна сустрэць нацыянальнае свята.*

*Цяпер па розных гарадах падарожнічае самадзейная перасоўная выстаўка, прысвечаная гадавіне кубінскай рэвалюцыі. Гэты здымак зроблен у час работы выстаўкі, арганізаванай кубінскімі студэнтамі, ва універсітэце. У якасці гіда выступае студэнт інстытута народнай гаспадаркі Дзіега Бероа.*

*Фота В. АДЗІЯНА.*

# КРОССВОРД



**По-горизонтали:** 3. Австралийское животное. 8. Прозрачное вещество. 9. Удлинённая форма рельефа. 10. Популяризация. 11. Украшение. 12. Долговой документ. 13. График работы сердца. 17. Шарф. 18. Шкаф. 20. Кристаллическое состояние воды. 21. Злак. 23. Женское имя. 24. Цветок. 25. Электрический прибор. 26. Определение направления на излучатель радиоволн. 32. Южный плод. 34. Озеро в Сев. Америке. 35. Марка автобуса. 36. Угол в небесной механике. 37. Войсковое соединение римлян. 38. Река в Ю. Америке.

**По-вертикали:** 1. Военный представитель при посольстве. 2. Костяк. 3. Спортивная площадка. 4. Советский гроссмейстер. 5. Змея. 6. Химический процесс. 7. Комическая сценка. 13. Единичный объект, предмет. 14. Контур. 15. Лечащий врач. 16. Море. 18. Стоянка бродячей народности. 19. Литературоведческий термин. 21. Столица европейского государства. 22. Фруктовый напиток. 27. Советский поэт. 28. Неприятное ощущение во рту. 29. Органический реактив. 30. Весёлая толпа, артель. 31. Искусственный сон. 33. Решето. 34. Европейская столица.

Составил **В. ВЕРБИЛО.**

# МАЛЕНЬКІЯ ЛЕГЕНДЫ

## 1. Дзівасіл

Даўнім, але не забытым людзьмі часам, калі спапяляючы сухавей зрываў недацвіўшую маладую квецень, адна непакорная кветка карэннямі сваімі ў родную зямлю ўрастала. У глыбіні зямной яна жывую ваду піла. А ўночы, калі ў цемры, збялтаўшы шляхі, сухавей некуды знікаў, з лісця той кветкі збягалі буйныя расінкі і шчодра паілі прагнае да жыцця маладое разнатраўе. І яно зноў зацвітала. Схіляліся жывыя сухвецці да той непакорнай кветкі. Яе стомленае лісце ўдыхала іх хмельны водар і чароўную сілу. Жывая вада з глыбіняў зямлі роднай вярталася да яе дзіўнай сілай. Здагадлівыя людзі, для якіх уратавана была квецень роднай зямлі, назвалі гэтую кветку дзівасілам.

І цяпер, калі людзі шукаюць дзівасіл, яны ідуць туды, дзе найбольш ярка цвіце маладая квецень. Так і знаходзяць яго. А сам дзівасіл ніколі не ведаў стракатай вопраткі.

## 2. Усмешка садоўніка

Аднойчы садоўнік сутыкнуўся з непадатлівай дзічкай. Прышчапіў да яе адну пладаносную пупышку — не прынялася. Дзікі сок перасіліў. Прышчапіў другую, трэцюю — яны згінулі пад шурпатай дзікай карою. Нехта даваў ужо садоўніку такую простую параду: «Выкінь, з карэннямі выкінь!»

Прайшло некалькі гадоў. Той самы «нехта», стомлены далёкай дарогай жыцця, спыніўся каля саду. Ён залюбаваўся буйнымі і свежымі, як сама маладосць, яблыкамі, якія крыху сарамліва хаваліся ў лісцях маладой яблыні. «Дай мне адзін, — папрасіў ён у садоўніка. — Гэта ад той?» «Ад той», — адказаў садоўнік. Чалавек беражліва ўзяў яблык, разагнуўся і, нібы не было той стомы, лёгка пакрочыў далей. Ціхутка задрыжэла на яблыні лісце, бліснулі румяныя яблыкі. А можа гэта ўсміхнуўся хітры садоўнік...

## 3. Канец спрэчкі

У студзёную пару заспрачаліся Мароз з Сіверам, хто з іх больш халодны і суровы. Мароз страляў, каб нагнаць на людзей страху, замуроўваў крыніцы, гладаў, як звер косці, кару садовых дрэў. Сівер папяліў людзям твары, сыпаў калючым холадам у вочы, захлёбваўся смехам на хутарах, выў галодным ваўком. Але самі яны вырашыць сваёй спрэчкі не маглі. Пакуль спрачаліся — вясна прыйшла.

**Рыгор ЦЫБУЛЯ.**

*Навагодні фельетон*

# 15 АПОШНІХ ХВІЛІН

Гадзіннік галоўпошты праспяваў у апошні раз. Без пятнаццаці дванаццаць. «Не спазніўся яшчэ»,—падумаў Дзед Мароз, сыходзячы з тралейбуса, і лёгкім трушком падаўся да параднага хода універсітэта. «Шыбуй са двара!» — прачытаў ён аб'яву. «Шыбуй-то шыбуй, але куды — налева ці направа?». Вока ў Дзеда было спрактыкаванае, і ён тут жа заўважыў пятлістую сцяжыну, што загінала за вугал медінстытута. На абледзянелых сходках ледзь не выцягнуўся. Яшчэ горш яму прыйшлося ў скверы: ніяк не мог адолець шматлікія перашкоды і раз-пораз узбіваўся ў цемры на халодныя муры. Ад сэрца крыху адлягло, калі ўбачыў ганак, на якім гудзеў шматлікі натоўп. Ды торба была тут Дзеду вельмі недарэчы. Хацеў ён таго ці не хацеў, аднак натоўп яго падхапіў, і Дзед пішчом праціснуўся праз адзіную, непамерна вузкую створку дзвярэй. Уздыхнуў.

— Пропуск! — грымнула над вухам, аж прысеў стары.

Для Дзеда гэта было нечакана. Разгубіўся ён, ды выручыў выпадак.

— Што здарылася? — пачуў ён знаёмы голас.

«О, то напэўна тут ўсё па-старому!— убачыўшы яго, падумаў Дзед.—Хоць... пропускі, нешта і новае?..»

Дзед крочыў калідорам, у якім параннейшаму было сапраўды бруднавата. Ён спяшаў павіншаваць з Новым годам і пажадаць добрага здароўя ўсяму універсітэцкаму начальству. Каля ліфта было завозна. Ды Дзеду пашчасціла. У кабіну аднак набралася з паўсотні студэнтаў, і як ні рыпеў матор— ні з месца. Ні з месца не сышоў і ніводзін студэнт. Сэрца Дзеда не вытрымала: не падумайце, што ён страціў прытомнасць. Як чалавек далікатны, ён выйшаў.

— Га-га-га! — загагатала ў ліфце.

Дзед быў рад, што хоць торба пры ім засталася. Убачыўшы густую павуціну на другім ліфце, Дзед пакрочыў да начальства пешкі.

...На шостым паверсе чыталі лекцыі нашы паважаныя вучоныя. Не павіншаваць іх Дзед Мароз проста не мог. На пятым паверсе засопся настолькі, што стаяць на нагах не мог. Ды ў прафесарскай гістфака — ніводнага крэсла. На шчасце, было адно ў кабінеце дэкана, і той гасцінна ўступіў яго Дзеду. Навокал стаялі антычныя фігуры, і тут Дзед зразумеў, што калі яны стаяць, то чаму не могуць пастаяць на перапынку выкладчыкі. Хацеў, праўда, вады напіцца, ды не знайшоў графіна: «А-а-а, статуі ж таксама не п'юць!».

Ачомаўшчыся, Дзед рушыў у калідор. З задавальненнем прачытаў насценгазету гісторыкаў. На чацвёртым паверсе таксама вісела нешта накшталт газеты. «Як гэта фізікі ўмудрыліся выпусціць газету без ніводнай ілюстрацыі?» — развёў ён рукамі.

На трэцім паверсе стэнд агітаваў запісвацца ў турысты. «А чаму б і не?» — падумаў Дзед. Ды раптам адскочыў. Чамусьці турыстаў стэнд называў... ішакамі. А на другім малюнку — дык і сказаць немагчыма: здаравіла-хлапец імкнуўся забіць цвік тым месцам, па якім звычайна гуляе бацькавая папружка, і гэта аб'яўлялася як залік на турыста...

Вялізная лічба «300» спыніла ля наступнай вітрыны. «Гм? Відаць, матэматыкі? Што яны падлічылі? — падумаў стары і стаў чытаць зноску. — Вось лабідуды, дачаўпліся: ці не два нумары выпусцілі за пятнаццаць гадоў, а перамножылі 15 на 20 і налічылі, што ўжо 300 нумароў газеты выпусцілі. Ці, можа, якія новыя метады падлікаў яны адкрылі?»

Па раскладу Дзед убачыў, што лекцыя ў выкладчыка матфака А. Ф. Наумовіча канчаецца праз хвіліну. Увесь перапынак чакаў ён, ды махнуў рукой. На перапынак ні Наумовіч, ні студэнты не выйшлі.

У агульнай канцылярыі Дзед убачыў, як спалі на пісьмах канцылярысты. «Хай паспяць, — пашкадаваў іх Дзед, — можа ў наступным годзе будуць чытаць і даваць адказы на пісьмы ў час».

Заглянуў Дзед у рэдакцыю. Тут кішэла ад аспірантаў, якія насядалі на рэдактара, каб хоць у шматтыражцы апублікавацца. Дзед цікавіўся, ці рэагуе грамадскасць на выступленні газеты.

— Яшчэ як! За тры дні да выхаду нумару, у якім з'явіўся матэрыял «Ці варта параўноўваць інтэрнат з зямлянкай?», у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова замянілі ложкі.

— То гэта ўсё-такі лепш, чым кіраўнікі матфака, паўгода маўчалі, пакуль адказалі на чэрвеньскія крытычныя выступленні газеты, — заўважыў стары.

— Гэта лепш зусім не лепш,—сказаў рэдактар. — Замененыя ложкі тры гады іржавелі ў падвале!..

— Я б хацеў, — сказаў Дзед Мароз,— павіншаваць усіх супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта па радыё.

— Дзеду, пачакай годзік, а, можа, болей, пакуль яго адрамантуюць.

І Дзед Мароз папрасіў тады, каб яго прывітанні перадала усім наша шматтыражка, што мы з вялікай ахвотай і робім.

**Даніла ШЫЛА**

# Пятрусь і Карусь

Карусь Пятрусю:
— Да Вас нядобрае ён тоіць...
Шу-шу, шу-шу...
Пятрусь Карусю:
—Акладзік трэба Вам падвоіць.
Заява ёсць? Што ж, падпішу!

**Іван РЫБКА.**

Рэдактар П. СІЛІВАНЧЫК.

Адрас рэдакцыі:
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок,
галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02569. Тыр. 2000. Зак. 4650.